бяздонных кладоўках беларускай кухні ёсць вялікае мноства разнастайных страў, што складаюць спецыфіку этнічнай культуры, выяўленне, захаванне і папулярызацыя якіх уяўляюць важнейшую задачу спецыялістаў у галіне этналогіі і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


*1.* Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Ф. 6. Воп. 13. Спр. 67. Арк. 26, 29.

*2. Навагродскі, Т. А.* Традыцыі народнага харчавання беларусаў / Т. А. Навагродскі. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2000. – 112 с.

*3. Навагродскі, Т. А.* Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX–XX стагоддзях / Т. А. Навагродскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2015. – 243 с.

*4. Навагродскі, Т. А.* Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX–XX стагоддзях : дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.07 / Т. А. Навагродскі. – Мінск, 2015. – 262 с.

*5. Никифоровский, Н. Я.* Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности : этногр. дан. / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. тип., 1895. – [4], VIII, 552, CLIV с.

*6.* Энциклопедия белорусской кухни / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : Беларус. Энцыкл., 2008. – 717 с.



УДК 398.34:572



**А. М. Нароўская,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*


# ЖЫЛЛЁ ЯК СІМВАЛ КУЛЬТУРЫ


**Анатацыя.** *Дом разглядаецца як інварыянтная ўніверсальная схема жылля, адлюстраваная ў будаўнічай абраднасці. Будаўнічы абрад даследуецца як культурны тэкст, які ўключае ў сябе абрады, міфы, фальклорныя тэксты, сімвалы. Выяўляюцца прынцыпы асваення чалавекам прасторы, пераўтварэння «прыроднага» ў «культурнае», «неасвоенага» ў «асвоенае». Аналізуюцца сімвалічныя сродкі для ўстанаўлення асноўных параметраў арганізаванай прасторы.*

**Ключавыя словы:** *культура, культурны сімвал, семіётыка, традыцыйнае жыллё, абрад.*

**A. Narouskaya,**
*PhD in History, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk, Republic of Belarus*

## DWELLING AS A SYMBOL OF CULTURE

**Abstract**. *In the article, the House is considered as an invariant universal scheme of dwelling, reflected in the building ritual. The construction ritual is studied as a cultural text, which includes rituals, myths, folklore texts, symbols. The author reveals the principles of human exploration of space, the transformation of the natural into the cultural, the undeveloped into the mastered. Symbolic means of establishing the main parameters of organized space are considered.*

**Key words**: *culture, cultural symbol, semiotics, traditional dwelling, ritual.*

*Уводзіны.* Жыллё – адзін з сімвалаў культуры, з якім суадносяцца важнейшыя характарыстыкі жыцця чалавека. Высокі семіятычны статус жылля накладаў адбітак на ўсю звязаную з ім будаўнічую абраднасць, што праяўлялася ў складаных рытуалах.

Будаўнічыя абрады адносяцца да ліку аказіянальных абрадаў, якія былі накіраваны як на стварэнне ідэальнага вобраза дома, так і на фарміраванне ідэальнага вобраза сацыяльнай групы (сям’і).

Праблема асваення прасторы – гэта выкананне правіл, забарон і папярэджанняў, якія існавалі ў дадзеным соцыуме. У культуры, арыентаванай пераважна на рытуал, адсутнічала аднастайная семіятычная сістэма, прызначаная для фіксацыі і захоўвання інфармацыі. У «вуснай» культуры дзеля захавання і трансляцыі інфармацыі прыроднаму і культурнаму асяроддзю чалавека (элементам ландшафту, часткам жылля, прадметам інтэр’ера) надаваўся знакавы характар

Найбольш цікавымі па тэме даследавання з’яўляюцца тэарэтычныя распрацоўкі Ю. М. Лотмана, А. К. Байбурына, У. М. Тапарова, Ус. Іванова. Цікавы погляд на семіётыку і семантыку рэчаў адлюстравалі ў сваіх даследаваннях Т. В. Валодзіна, У. А. Лобач. Значная колькасць матэрыялаў, якая ўключае абрады пры пабудове жылля, утрымоўваецца ў работах М. Я. Нікіфароўскага, Ю. Ф. Крачкоўскага, П. В. Шэйна, А. К. Сержпутоўскага.

*Асноўная частка*. Адным з аб’ектаў даследавання традыцыйнага жылля з’ўляецца абрад, паколькі ў народнай культуры менавіта абрады служылі асноўным сродкам перадачы схем асваення прасторы падчас

будаўніцтва жылля. Будаўнічы абрад можна разглядаць як адзін з галоўных, што абумоўлена выключнай роллю жылля ў сістэме ўспрымання свету.

Як адзначае А. К. Байбурын, прастора, у якой жыве чалавек, характарызуецца пэўнай семантычнай дыскрэтнасцю: адны часткі маюць станоўчыя, а другія – адмоўныя характарыстыкі [2, с. 45]. Выбар месца для будаўніцтва жылля меў істотнае значэнне. Ён быў накіраваны на выяўленне сапраўднай інфармацыі аб тэрыторыі, на якой планавалася будаўніцтва. Найбольш небяспечным лічылася месца, дзе раней праходзіла дарога. Гэта тлумачыцца тым, што дарога на ўзроўні рытуальна-міфалагічных значэнняў з'яўляецца пачаткам ці працягам свету мёртвых. Парушэнне забароны будаваць дом на месцы нават былой дарогі, па ўяўленням беларусаў, магло прывесці да смерці яго жыхароў [5, с. 203].

Другім адмоўным месцам лічылася лазня: перыферыйнае размяшчэнне, блізкасць да вады абумовілі фарміраванне ўяўленняў аб лазні як аб нячыстым месцы.

Пры вызначэнні месца для будаўніцтва жылля браліся ў разлік і падзеі, зарэгістраваныя калектыўнай памяццю як адмоўныя. Па звестках М. Я. Нікіфароўскага, беларусы Віцебскай губерні выкарыстоўвалі шэраг перасцярог: «Не раілася будаваць жыллё там, дзе былі знойдзены чалавечыя косткі; дзе воўк ці мядзведзь "аблажыў і зарэзаў буйную стачыніну; дзе чалавек парэзаў руку або нагу да крыві тапаром, нажом або касой; дзе перакуліўся воз ці зламалася аглобля. Непажадана было будаваць жыллё і на месцы хаты, спаленай перунамі ці пакінутай у выніку хвароб"» [6, с. 134–135].

Адпаведна шчаслівым месцам лічылася тое, калі хатка стаяла альбо будавалася на «*дедывщини*» ці «*бацькывщини*», калі яна знаходзілася на «*сваёй вячнини*» (на ўласнай зямлі). Шчаслівым месцам лічылася і тое, на якое клалася свойская жывёла. У міфалагічных тэкстах свойская жывёла разглядалася як сімвал хатняга дабрабыту. Такім чынам падкрэслівалася ідэя ўстойлівасці, якая мела вялікае значэнне для семантыкі жылля.

Беларускі народ данёс да XIX ст. магічную ідэаграму, закладзеную ў аснове дома як мадэлі Сусвету. Па звестках этнографа В. Багданава, беларусы ў сярэдзіне XIX ст. на месцы будучай сядзібы чарцілі квадрат, які не павінен быў быць большы за 9 крокаў, яго дзялілі крыжападобнай фігурай на 4 часткі. Пасля гэтага гаспадар сям'і ішоў «ва ўсе чатыры бакі і прыносіў з чатырох палёў чатыры камяні, якія ўкладвалі ў цэнтры малых квадратаў» [8, с. 42–52]. У выніку на месцы будучай сядзібы з'яўлялася ідэаграма ўрадлівасці. Па звестках М. Я. Нікіфароўскага, у Віцебскай губерні існавала іншая мадэль, якая таксама ўяўляла чатырохкутнік, бакі якога не павінны быць больш за дзевяць крокаў [6, 134–135].

Такім чынам, разглядаемыя ідэаграмы, магчыма, з'яўляюцца фрагментам старажытнаіндыйскай касмічнай Мадэлі Мандалы, якая тлумачыць пабудову Сусвету. Выбар месца для будаўніцтва жылля быў заснаваны на прынцыпе мадэлявання жыцця сям'і на канкрэтным месцы. Акаляючая чалавека прастора падзялялася па прыкметах «станоўчае/адмоўнае», «шчаслівае/нешчаслівае».

Важнымі ў народным дойлідстве былі выбар і нарыхтоўка будаўнічага матэрыялу, павіннага адпавядаць не толькі ўтылітарна-практычным, але і сімвалічным рытуальным функцыям. Пры выбары дрэва для будучага жылля дзейнічаў прынцып «*забарона/дазвол*», пры гэтым сістэма забароны з'яўлялася вызначальнай. Забаранялася выкарыстоўваць у будаўніцтве дрэвы, паваленыя бурай, – вываратні: па павер'і, злыдні могуць пасяляцца і ў новую хату, і яна рана ці позна будзе разбурана стыхіяй.

Забаранялася пры будаўніцтве дома выкарыстоўваць «свяшчэнныя дрэвы», якія раней раслі на могілках альбо на месцы, дзе стаяла царква, капліца. Свяшчэннымі лічыліся і дрэвы-адзіночкі – яны раслі аддзелена ад астатніх дрэў. Не выкарыстоўвалі ў будаўніцтве старыя дрэвы, сваім доўгім векам яны атрымалі права на жыццё да старасці [3, с. 29–30].

Існавала забарона і на вырубку «маладняка». Гэта забарона выклікана, хутчэй за ўсё, імкненнем зберагчы малады лес [6, с. 134]. Забарона ў адносінах да старых дрэў уваходзіць у кола ўяўленняў, звязаных з іерархіяй узросту ў рэлігійна-міфалагічнай тэме, дзе «старэйшы» і «сакральны» звычайна з'яўляюцца сінонімамі.

Такім чынам, антытэза «*сухое дрэва / сырое / зялёнае дрэва*» адыгрывала істотную ролю ва ўяўленнях рэлігійна-міфалагічнага характару. Сухому дрэву прыпісваліся якасці «мёртвага», якое «не мае жыццёвых сіл». Вынікам парушэння забароны нарыхтоўваюць сухія дрэвы лічыліся так званыя «сухоты», ад якіх будуць пакутаваць жыхары пабудаванага дома.

Да спецыфічных трэба аднесці і ўяўленні аб так званых «буйных дрэвах», якім прыпісвалася разбуральная сіла. З «буйнымі» дрэвамі Д. К. Зяленін параўноўвае «стаяросавыя» дрэвы» (у беларусаў) [4, с. 41–43]. «Стаяросавыя», ці «буйныя», дрэвы растуць на перакрыжаванні дарог і звязваюцца з месцам знаходжання нячыстай сілы. Як указваецца ў этнаграфічных крыніцах, тут чэрці качаюць яйкі, у свайку гуляюць.

Такім чынам, важнае значэнне для будаўніцтва жылля меў выбар дрэва. Пры гэтым улічваліся як якасці, так і сакральны сэнс будаўнічага матэрыялу. Ужо на гэтым, папярэднім этапе будаўніцтва закладваліся асноўныя параметры, якія вызначалі нармальнае функцыянаванне дома.

Будаўніцтва жылля пачыналася з вызначэння рытуальнага цэнтра, дзе ўстанаўлівалі маладое дрэўца або зроблены цесляром крыж, які стаяў да заканчэння будаўніцтва. Сувязь дрэўца (крыжа) з канцэпцыяй Сусветнага дрэва відавочная. Гэты сімвал надае міфалагічны сэнс не толькі будучай пабудове, але і самому працэсу яе ўзвядзення.

Абрад ахвярапрынашэння звычайна быў звязаны з укладкай першага бервяна. Звычайна ў першы дзень цесляры кладуць толькі адзін вянец, пасля чаго ідзе «закладачнае» частаванне.

У этнаграфічнай літаратуры ёсць шматлікія тлумачэнні ахвярапрынашэнням пры будаўніцтве новага жылля. Так, напрыклад, А. Афанасьеў адзначае, што «дом не інакш можа быць пабудаваны, як на галаву аднаго з тых, хто будзе жыць у ім» і што «ні адзін дом не можа стаяць без аховы яго сцен радавым пенатам» [1, с. 83].

Аднак, паводле вераванняў сялян, чалавечай смерці пры пабудове жылля можна пазбегнуць. Для гэтага трэба прынесці ў ахвяру якуюнебудзь жывёлу. Прычым у розных губернях былі свае асаблівасці. На тэрыторыі каля Лепеля пры закладцы новага дома адсякалі галаву пеўню, якую і зарывалі ў зямлю ці проста клалі пад кутні камень; пеўня з'ядалі. А. Я. Багдановіч бачыў у гэтым «рэшткі папярэдніх ахвяр дамавіку», як і ў звычаі затыкаць у вуглы і адтуліны дома чалавечыя валасы, а таксама пазногці.

У міфапаэтычных тэкстах жывёла выступае як адзін з варыянтаў міфалагічнага кода, на аснове якога могуць з'яўляцца цэлыя паведамленні. Так, напрыклад, як певень, так і конь, надзяляліся апатрапейнай сілай [7, с. 14]. Яны звязваліся ў народных уяўленнях з агнём і вадой, з'яўляліся сімвалам агню. Прыведзеныя даныя сведчаць аб невыпадковым выбары каня і пеўня ў якасці ахвяры пры будаўніцтве дома.

Замена «жывой ахвяры» прадметамі (поўсць, зерне, грошы) адбываецца ў больш позні час. У семантычным сэнсе яны маюць шырокі спектр значэнняў і выступаюць у сваёй «метанімічнай функцыі»: у пэўнай ступені іх змест вызначае семантыку жылля. Поўсць жывёлы з'ўлялася рытуальным сімвалам, які звязаны з такімі паняццямі, як «урадлівасць», «багацце», «дабрабыт». Зерне – гэта ахвярны матэрыял, распаўсюджаны не толькі ў славян, але і ў іншых народаў. Яно мае ўстойлівую семантыку «ўрадлівасць», «багацце». Семантыку папярэдніх двух сімвалаў паўтараюць грошы (манеты).

Першаму вянцу дома прыпісвалася глыбокае сімвалічнае значэнне. Першыя вянцы зруба дзеляць усю прастору на жылую і нежылую, асвоеную і неасвоеную. Будаўніцтва жылля ўносіла ідэю арганізацыі як унутранай, так і вонкавай прасторы. Як піша М. Я. Нікіфароўскі: «…усе шчэпкі пры рубцы першага вянца неабходна сабраць у сярэдзіну чатырохкутніка, каб усё, што адбываецца, было вядома толькі ў хаце, а не за межамі яе» [6, с. 136]. З гэтага фрагмента тэксту бачна, што тое, што адбывалася ў доме, надзялялася станоўчым сэнсам, па-за межамі – адмоўным.

Апошнім этапам будаўнічага цыкла з'ўляецца асваенне новага дома і пераход у яго. Перш чым перайсці ў новае жыллё, пускалі чорнага пеўня, курыцу альбо чорнага ката і па іх паводзінах меркавалі аб новым доме. Згодна звестак інфарматара (К. А. Панчэня, в. Пагост, Жыткавіцкі р-н

Гомельскай вобл.): «У в. Пагост першым пускалі ў дом трохмасцівага ката, бо ён быў сем'янін».

У Віцебскай губерні, калі першы раз уваходзілі ў новае жыллё, праз расчыненыя дзверы кідалі клубок нітак, і, трымаючыся за нітку, уся сям'я заходзіла па старшынстве ў дом. Тое, што ўваходзяць у дом па старшынстве, асацыюецца з уяўленнямі аб смерці: першы, хто ўваходзіць, той першы і выходзіць. З іншага боку, сама прастора жылля атрымоўвае іншае міфалагічнае асмысленне.

Пры перасяленні ў новы дом асаблівая ўвага надавалася перанясенню «долі» папярэдняга жылля ў новае. У першую чаргу пераносіліся такія культурныя сімвалы, як абразы, гаршчок з вуголлем і хлеб. Запаўненне ўнутранай прасторы новага дома – аналаг запаўнення свету рэчамі пасля яго стварэння. Першымі ўносяцца рэчы, якія маюць найвышэйшы культурны статус: хатні агонь, хлеб, соль, дзяжа з цестам, абразы.

Абавязкова запрашалі дамавіка, пры гэтым гаспадар прыходзіў уначы ў старую хату, кланяўся на ўсе чатыры бакі і запрашаў дамавіка перайсці жыць у новую хату. У новым доме, каля печкі альбо на гарышчы, яму ставілася частаванне – малако і хлеб. Падрабязныя апісанні дамавіка даюцца ў этнаграфічных працах П. Дземідовіча, М. Я. Нікіфароўскага, А. Я. Багдановіча і інш.

Пераход у новы дом завяршаўся рытуальнай вячэрай на покуці. У аснове такой вячэры былі асноўныя матывы рытуалу: 1) збіранне (членаў сям'і, прадуктаў харчавання, хатняга посуду); 2) прыгатаванне цэлага з асобных кампанентаў (хлеба ці кашы з зерня); 3) раздзел цэлага і размеркаванне паміж удзельнікамі абраду (надзяленне кожнага часткай агульнай долі сям'і).

*Заключэнне.* Такім чынам, адпаведна міфалагічнай мадэлі любое грамадства імкнецца знаходзіцца на тэрыторыі асвоенай і арганізаванай прасторы. Гэта дасягалася пры дапамозе будаўнічага абраду, які ўяўляў сабою культурны тэкст. Ён уключаў у сябе традыцыйны міфалагічны комплекс уяўленняў, павер'яў і забарон, фальклорныя тэксты, якія былі найкаштоўнейшымі для носьбітаў традыцыі. Выкананне ўсіх правілаў будаўніцтва з'яўлялася залогам дабрабыту сям'і ў будучым доме.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. *Афанасьев, А. Н.* Поэтические воззрения славян на природу: опыт сравнительного изучения славянских преданий и верований, в связи с мифическими сказаниями других родственных народов: [в 3 т.] / А. Н. Афанасьев. – М. : Изд. К. Солдатенкова, 1865–1869. – Т. 2. – 1868. – 800 с.

2. *Байбурин, А. К.* Жилище в обрядах и представлениях восточных славян / А. К. Байбурин. – Л. : Наука, Ленингр. отд-ние, 1983. – 191 с.

3. *Богданович, А. Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: этногр. очерк / А. Е. Богданович. – Гродно : Губерн. тип., 1895. – III, 186 с.

4. *Зеленин, Д. К.* Тотемы-деревья в сказаниях и обрядах европейских народов / Д. К. Зеленин. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1937. – 78 с. – (Тр. Ин-та антропологии, этнографии и археологии / АН СССР; т. 15, вып. 2).

5. *Крачковский, Ю. Ф.* Быт западнорусского селянина / Ю. Ф. Крачковский. – Изд. Имп. о-ва истории древностей рос. при Моск. ун-те. – М. : Унив. тип. (Катков и К°), 1874. – 212 с.

6. *Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, северные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. типолитогр., 1897. – 307 с.

7. *Нікольскі, Н. М.* Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваньнях беларускага сялянства / Н. М. Нікольскі ; адк. рэд. П. Ізох. – Менск [Мінск: б. в.], 1933. – 136 с.

8. *Рыбаков, Б. А.* Язычество древних славян / Б. А. Рыбаков ; Рос. акад. наук, Отд-ние истории, Ин-т археологии. – М. : Наука, 1981. – 607 с.

УДК 130.2(476)

**А. А. Падалінская,**
*кандыдат філасофскіх навук, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

## РОЛЯ ТРАДЫЦЫЙ І ТРАДЫЦЫЙНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫМ СВЕЦЕ БЕЛАРУСАЎ

**Анатацыя.** *Разглядаюцца роля і значэнне традыцый у сучасным беларускім грамадстве, сістэма традыцыйных каштоўнасцей беларусаў і яе ўздзеянне на маральна-этычную сферу грамадства, а таксама інавацыйная галіна гуманітарыстыкі – этнааксіялогія, якая займаецца вывучэннем светапоглядных, светаўяўленчых і аксіялагічных асноў традыцыйнага грамадства беларусаў, даследаваннем каштоўнасных установак і стэрэатыпаў грамадскай свядомасці, выяўленнем спецыфікі этычных канцэптаў.*

**Ключавыя словы:** *традыцыі, традыцыйныя каштоўнасці, нацыянальна-культурная ідэнтычнасць, універсаліі культуры, этнааксіялогія, маральна-этычныя канцэпты, парэміялогія.*

**A. Padalinskaya,**
*PhD in Philosophy, Senior Researcher of the State Scientific Institution "Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus", Minsk, Republic of Belarus*